«Народная Воля» в Facebook www.facebook.com/nv.online.info,
в Vkontakte www.vk.com/nvonlineinfo

№ 43 (4603)

11 чэрвеня 2021 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

Дзякуй усім, хто падтрымлівае «Народную Волю» ў гэты надзвычай цяжкі час.
Рэдакцыя.

100 РАДКОЎ



Міхася СКОБЛЫ

Газетныя кілеры

Час ад часу гартаючы дзяржаўныя газеты і праглядаючы дзяржаўнае тэлебачанне, я міжволі задаюся пытаннем: дзе навучаліся журналісты, што там працуюць? На журфаку БДУ? Ці ў нейкіх чалавеканенавісніцкіх спецшколах, дзе здавалі экзамены па спецыяльнасці «забойства словам»? Такое ўражанне, што некаторыя з іх узялі на сябе функцыі сумнавядомых сталінскіх троек, якія ў 1930-я гады ў пазасудовым парадку за пяць хвілін прыгаворвалі гэтак званых «ворагаў народа» да найвышэйшая меры. Прыгаворваюць і сёння. Не журналісты пайшлі, а пракуроры і кілеры па сумяшчальніцтве.

І першую пазіцыю ў рэйтынгу газетных кілераў упэўнена займае Андрэй Мукавозчык – сталы аўтар газеты «Беларусь сегодня». Кадр, які ў 1937-м абавязкова спатрэбіўся б – каля расстрэльных ям у Курапатах. Тагачасныя газетныя далакопы Бэндэ і Кучар – смаркачы ў параўнанні з ім. Мукавозчык у кожным нумары выяўляе ворагаў, чыніць паспешлівы самасуд і – ставіць да сценкі.

«Я слово «демократия» не произношу, а сплёвываю», – пагардліва прызнаецца ён і, нібы вядро з памыямі, перакульвае на галовы чытачоў сваю «накіпелую» публіцыстыку, якая, нібы здыхляціна чарвякамі, ажно кішыць гэтак любымі сэрцу Мукавозчыка слоўцамі *«мразота»*, *«недоумок»*, *«мразь без совести»*, *«потенциальные полицаи»* і г.д. Гэта – пра маладых журналістак «Нашай Нівы» (*«дурно пахнущей, загаженной нивы»* ў Мукавозчыкавым разуменні). А заслужылі яны анафему ад ненавісніка дэмакратыі тым, што напісалі пра экскурсіі па месцах масавых пратэстаў у Мінску.

Далей Мукавозчыкава рука ад камп'ютарнай клавіятуры нервова цягнецца да ўяўнага нагана: *«Нашаніўкі, случись война, станут первыми в рядах подстилок. Будут хрустеть шоколадными обёртками, ходить на службу за пайком и усердно тянуть ручку: «Яволь, фрау штутгартфюрер!»*.

Пасля *«штутгартфюрера»* (маецца на ўвазе Святлана Ціханоўская) газетны кілер лёгка ловіць у прыцэл увесь яе штаб. Франака Вячорку ён абзывае *«прошаренным гебельсёнком»*, Рамана Пратасевіча параўноўвае з нарвежскім тэрарыстам Брэйвікам (які, нагадаю, уласнаручна расстраляў 84 чалавекі). *«А что, у кого то есть сомнения*, – распаляе сябе Мукавозчык, – *что Ромочка стал бы стрелять очередями от пуза?»* І – усіх *«подстилок»*, *«гебельсёнков»* і брэйвікападобных з выразам праведнага гневу на твары падводзіць да ямы з жоўтым пясочкам: *«Таких надо просто вбивать в землю – сразу, без раздумий и без соплей»*.

Калі гэта не заклік да расправы і самасуду, не распальванне варажнечы, то – што? І для чаго тады ў Крымінальным кодэксе існуе артыкул 130, які прадугледжвае суровае пакаранне за такія заклікі? Ды з'явіся нешта падобнае ў «Народнай Волі» ці згаданай ужо «Нашай Ніве» – аўтараў публікацый ды і рэдактараў тут на пацягнулі б у суд.

Я не адвакат Ціханоўскай і Вячоркі, тым больш не фанат Пратасевіча, мяне прота абурае, што з народнай кішэні (у тым ліку з маёй) выплачваецца заробак і ганарар пісаку, які з паталагічнай упёртасцю сее варажнечу, абражае чалавечую годнасць і заклікае да фізічнага знішчэння (так!) нашых суайчыннікаў (у дадзеным выпадку мяне не цікавяць іх палітычныя погляды). Для такога *«вбить в землю»* чалавека – як дажджавога чарвяка на ходніку растаптаць.

Тыя самыя кілерскія прыёмы выкарыстоўвае ў сваіх пісаннях яшчэ адзін аўтар «СБ» – Вадзім Гігін (між іншым, кандыдат гістарычных навук). Заўзята выкрываючы калабарантаў, ён дапісаўся да таго, што назваў паважанага ў свеце дзеяча беларускай эміграцыі, гісторыка Янку Запрудніка… эсэсаўцам. Э-сэ-саў-цам! І паварнуўся ж язык ляпнуць такое пра падлетка (у 1941-м Запрудніку было ўсяго 15 гадоў)! Што ж, брахаць – не цэпам махаць. Але ж і брахня, каб у яе паверылі, павінна быць хоць трошкі праўдападобнай. А тут – проста высмактаны з пальца паклёп, поўная дыскваліфікацыя. У гісторыка, які не адрозніввае Саюз беларускай моладзі ад падраздзяленняў СС, ВАК проста абавязаны адабраць кандыдацкае пасведчанне. Так калісьці, можа, і станецца, як ужо сталася з адным ганаровым доктарам Кіеўскага ўніверсітэта…

Сталінскія пагромшчыкі Бэндэ і Кучар жыўцом закопвалі ў зямлю Купалу і Коласа, называлі народных паэтаў *«буржуазнымі нацдэмамі»* і *«нацыянал-фашыстамі»*. А калі здох іх сухаркі гаспадар, бегалі па бібліятэках і патаійком выразалі лёзамі з газетных падшывак свае пагромныя артыкулы.

Думаю, падобнай працэдуры праз пэўны час вымушаны будуць заняцца і розныя мукавозчыкі, гігіны, гладкія, церахі і іншыя, якія сёння, з'ялюючыся газетнымі кілерамі, руйнуюць людскія лёсы. Магчыма, яны ўжо цішком пачалі запасацца лёзамі. Толькі дарэмна ўсё гэта. Бо, як вядома, напісанага пяром не высечаш і тапаром. А тым больш не саскрабеш кітайскім танным аднаразовым лязом.

МНЕНИЕ

Владимир АСТАПЕНКО, экс-посол:

«Мы получаем любопытную информацию о том, что на самом деле происходит в коридорах власти в Беларуси»

– После президентских выборов достаточно большое количество квалифицированных, опытных дипломатических работников вынуждены были покинуть дипломатическую службу, – *сообщил в эфире канала «Цэнтр новых ідэй» бывший посол Беларуси в Аргентине Владимир Астапенко.* – Большая их часть сделала это непублично, то есть подавали заявления по собственному желанию либо по окончании срока трудовых контрактов покидали службу.

Этот процесс проходит до сих пор. Многие возвращающиеся из загранкомандировок уже не попадают на работу в центральный аппарат под предлогом объявленного сокращения, под предлогом неблагонадежности и т.д.

Я думаю, что те люди, которые сегодня покинули дипломатическую службу и действительно переживают за народ, за будущее нашей страны, с большим удовольствием в новой Беларуси вернутся на эту дипломатическую службу.

При этом бывший посол не считает, что многие дипломаты, и он в том числе, займутся политической деятельностью.

– Вряд ли я ожидаю увидеть среди настоящих или будущих дипломатов политиков, и себя отношу к ним. Дипломатическая служба – это государственная специфическая служба, требующая специальных навыков и компетенций. Политика – это нечто другое.

И в прошлом у нас не так много примеров, когда люди с дипломатической службы попадали на политическую сцену. Пример депутата Савиных меня в этом плане не впечатляет, потому что он был назначенным депутатом. Такой пример, думаю, не будет интересен в новой Беларуси, – *отметил Астапенко.*



Он также рассказал о том, кто из нынешних госслужащих сможет остаться на своих должностях после смены власти.

– У нынешних чиновников есть понимание того, что в будущем всё будет иначе. Представители демократических сил Беларуси на протяжении всего времени после выборов имеют обратную связь с государственными служащими.

В рамках этих контактов мы получаем очень любопытную информацию о том, что на самом деле происходит в коридорах государственной власти в Беларуси. Мы знаем о том, что очень многие эти коридоры уже покинули, знаем о том, что многие хотят, но очень сильно боятся уйти.

Знаем, к сожалению, конкретные примеры, когда попытки в спокойном режиме расстаться с госслужбой приводят к тяжелым юридическим последствиям.

Но в любом случае мы знаем всех наших потенциальных активистов, а также знаем тех, кто все-таки не сделал свой выбор и не встал на сторону народа. Поэтому, я думаю, что новая Беларусь будет иметь преданных, сильных и профессиональных чиновников, которые будут защищать народные интересы гораздо лучше, чем это происходит сегодня, – *отметил дипломат.*

ПЕРСОНА

Владимир ЯПРИНЦЕВ:

«Я простил, но забыть не смогу…»

*Бывший друг и бизнес-партнер основателя компании «Трайпл» **Юрия Чижа**, многократный чемпион мира по самбо **Владимир Япринцев** на днях дал интервью ютуб-каналу «Время побеждать». Журналистка **Ольга Долматова** около часа расспрашивала бизнесмена не только о спорте. «Народная Воля» обратила внимание на несколько акцентов этого интервью.*



Не секрет, что в последнее время Владимир Япринцев много ездит по разным странам. Чаще всего бывает в Монголии. Чем он сейчас занимается?

«Стараюсь, чтобы продукция из Беларуси, самосвалы «БелАЗ» были востребованы на территории России и Монголии, сотрудничаю со многими компаниями из Беларуси», – рассказал Япринцев в интервью.

Владимира Япринцева многие считают олигархом. Он сам говорит, что это не так: *«Я никогда олигархом не был. И никогда не оценивал человека по количеству денег. Я знаю очень богатых людей, со многими общался, на яхтах у многих бывал. И они выходили ко мне не в джинсах Стефано Ричи, а в обычных шортах и шлепанцах на босую ногу…*

Я богат друзьями и отношениями своими со своими близкими людьми. Не думаю, что мои близкие меня считают олигархом».

Владимира Япринцева называют крайне порядочным человеком. Даже в самые трудные минуты своей жизни он не изменил своим джентльменским принципам и не материл тех, кто, казалось бы, этого заслуживал. Но Япринцева по-прежнему смущают комплименты и похвала.

«Когда тебя хвалят – никогда не перебивай!» – цитирует Владимир Геннадьевич слова известного спортсмена **Давида Рудмана**, сказанные не так давно в его адрес.

У Владимира Япринцева были огромные финансовые обязательства. В общей сложности на нем был долг около 40 миллионов долларов. До конца он с долгами еще не рассчитался.

«Говорят, долги нам не дают спать, – говорит Япринцев. – *Но я не совсем согласен с таким утверждением. Я знаю одно: долги надо отдавать. Но не делать так, чтобы продать всё, что у тебя есть, и потом посыпать голову пеплом. Надо контактировать с человеком, которому ты должен. Он должен быть уверен, что у тебя есть желание отдать долги. Не надо оставлять долги своим детям – еще не известно, потянут ли они их! Надо свой чемодан самому нести»*.

Япринцев – верующий человек.

«Я пришел к вере намного раньше, чем в 2015 году, и считаю, что это помогло мне достойно себя вести и выстоять в трудные моменты», – признается он. – *Это всё благодаря вере, которая жила и живет в моем сердце. Я с уважением отношусь и к православию, и к буддизму, и к иудаизму. Я уверен, что Бог один, но молимся и просим мы его по-разному. Но мы всегда в конце концов говорим: «Слава Богу!» И даже неверующие говорят: «Господи, помоги…»*

На вопрос «В чем сила?» Япринцев отвечает просто: *«В правде. Подлость, хитрость, коварство – они побеждают на короткий промежуток времени»*.

Владимир Япринцев – крестный отец одного из сыновей **Юрия Чижа**, который, как сообщала «Народная Воля», до недавнего времени находился в следственном изоляторе КГБ. Владимир Япринцев не комментирует дело Чижа. И называет его своим бывшим другом, предательство которого пережил довольно тяжело.

«Вспоминать даже не хочется, когда я понял, что меня предали, – говорит Япринцев. – *Я не ожидал… И дай мне Бог, чтобы никогда больше такого не было. Наверное, человек по-другому не мог. Может, такие обстоятельства были. Но я простил. Забыть не смогу, но простил. Кто я такой, чтобы не простить? Я с юмором и критикой к себе отношусь, поэтому я простил. У меня очень много было с тем человеком хорошего, и я не могу это забывать. Может, я в этой жизни добился многого благодаря этому человеку. Наверное, эта ситуация была нам для чего-то дана…»*

В этом году у Япринцева юбилей – в августе ему исполнится 60 лет. Раньше в свой день рождения он устраивал пир на весь мир. Сейчас, говорит, так праздновать день рождения не намерен: *«Самый дорогой подарок? Помню, на 16 лет мне друзья подарили часы "Кардинал". Я не мог себе позволить купить такие часы, хотя уже был чемпионом. А так и машины дарили мне, но даже неудобно этим хвалиться. Очень много вещей, которые мне дарили, я отдавал пользоваться друзьям. Всё же эмоции мне намного дороже. Но те дни рождения, как я раньше праздновал, такие я больше не буду проводить…»*

В жизни Владимира Япринцева были и высокие взлеты, и очень громкие падения.

«Когда падаем – обязательно встаем!» – говорит он и улыбается, несмотря ни на что.

Марина КОКТЫШ.

ЧАСТНАЯ ЖИЗНЬ



Дмитрий Павличенко попал в реанимацию

Больше недели бывший командир СОБРа и воинской части 3214 провел в одной из больниц Минска, куда попал с коронавирусом.

Напомним, что Дмитрий Павличенко – один из главных фигурантов громких дел об исчезновениях **Юрия Захаренко**, **Виктора Гончара** и **Анатолия Красовского**. Дмитрий Павличенко руководит Белорусской ассоциацией ветеранов подразделений специального назначения войск МВД «Честь», в последние годы вел не сильно публичный образ жизни. Однако во время массовых протестов минувшего года был замечен не только на митинге в поддержку Лукашенко, но и среди его ближнего круга – фото Павличенко с пресс-секретарем Лукашенко **Натальей Эйсмонт** разлетелось по многим сайтам. Проходила информация, что Павличенко был одним из главных консультантов по разгону акций протеста и что не без его влияния случилась отставка министра внутренних дел **Юрия Караева**.

В свое время Дмитрий Павличенко перенес операцию на сердце, судя по всему, коронавирус для него не прошел без осложнений.

За предпоследние сутки в Беларуси было зарегистрировано 966 пациентов с COVID-19.

Врачи настоятельно рекомендуют делать прививки от коронавируса даже тем, кто уже переболел, а в Европе вводят специальный «ковидный паспорт» – свободно путешествовать без него в ближайшее время будет крайне затруднительно.

Как сообщает Минздрав Беларуси, уже более 656 тысяч человек получили первую дозу вакцины против COVID-19, из них более 358 тысяч прошли полный курс вакцинации.

Напомним, что в Беларуси сегодня можно привиться двумя вакцинами – китайской и российской.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ



Сергей КАЛЯКИН:

«Привился «Спутником»

Председатель Белорусской партии левых «Справедливый мир» пару недель назад сделал прививку от коронавируса.

«Привился российской вакциной, -- рассказал **Сергей Калякин** «Народной Воле». – *Хотя был выбор – можно было и китайской, но я выбрал «Спутник». Прививку делал в обычной районной поликлинике, всё прошло без проблем. Люди постепенно подходили, некоторые приходили без записи и интересовались, можно ли привиться. И им делали прививку сразу после осмотра терапевтом.*

Впечатлений после прививки особенных не было – ни боли, ни неприятных ощущений.

Я коронавирусом официально не болел. Хотя, когда всё только начиналось, я приболел, и было впечатление, что как-то очень необычно болею. Но выздоровел, тесты на антитела не сдавал. Может, в легкой форме и перенес. Это тот случай, когда меньше знаешь – лучше спишь».



Павел КОЗЛОВСКИЙ:

«Коронавирус перенес на ногах»

*По информации «Народной Воли», уже вторую прививку от коронавируса сделал и экс-министр обороны Беларуси генерал **Павел Козловский**.*

Он тоже привился российским «Спутником».

Осенью минувшего года у Козловского коронавирусом заболела жена, она попала в госпиталь. А сам Павел Павлович на здоровье не жаловался и свой привычный образ жизни практически не менял.

«Когда жену выписывали, мне тоже сделали тест на коронавирус, и он дал положительный результат, – рассказал Козловский «Народной Воле». – *Я удивился, потому что чувствовал себя, как всегда. И запахи были на месте, и температуры не было. Вообще никаких симптомов! Врачи сказали, что я коронавирус перенес на ногах.*

После прививки у меня не было никакого дискомфорта – ни после первой дозы, ни после второй. Разве что место укола побаливало, но терпимо. Я много работаю физически на даче, в бассейне несколько раз в неделю плаваю – всё в порядке.

На мой взгляд, прививку нужно делать обязательно. Лучше с этим вирусом не шутить!»

Марина КОКТЫШ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Прашэння аб памілаванні пісаць не збіраецца…»

Маці палітвязня Дзмітрыя Фурманава распавяла «Народнай Волі» пра спатканне з сынам пасля яго выхаду з карцара.

Дзмітрый Фурманаў разам з **Яўгенам Разнічэнкам** і **Уладзімірам Кнігам** быў фігурантам так званай «справы Ціханоўскага».

Іх затрымалі разам з Сяргеем Ціханоўскім у сувязі з пікетам па зборы подпісаў 29 мая 2020 года.

Суд над Фурманавым, Разнічэнкам і Кнігам са студзеня 2021 года праходзіў у Гродне. Дзмітрыя вінавацілі ў арганізацыі дзеянняў, якія парушаюць грамадскі парадак, суд абвясціў для яго прысуд – 2 гады калоніі агульнага рэжыму.

18 мая Дзмітрый Фурманаў быў адпраўлены ў карцар, а пасля выхаду яму дазволілі сустрэчу з бацькамі…

– На гэтым тыдні было спатканне, – кажа Вольга Іванаўна, маці палітвязня. – Спрабавалі сыну давесці, што не варта біцца лбом у сценку, ісці на канфрантацыю з адміністрацыяй ізалятара, бо зноў можна патрапіць у карцар, але сын сказаў так: «Мама, я сам ведаю, што мне рабіць у той ці іншай сітуацыі. За мяне не хвалюйцеся».



Акрамя таго, Дзіма паведаміў, што зараз ён знаходзіцца ў перавалачнай камеры, у якой на чатыры ложкі – шэсць чалавек.

Два тыдні ўжо не мыўся, хаця на прагулку вадзілі, пакуль знаходзіўся ў карцары. Ні лістоў, ні кніг таксама не было, таму нічога іншага не заставалася, як толькі займацца спортам. Папрасіў яму пальчаткі даслаць, каб лепш было ад падлогі адціскацца. Месяцы чатыры таму ўжо перадавалі пальчаткі, але, мабыць, ужо прыйшлі ў нягоднасць.

– Колькі Дзмітрый адсядзеў у карцары?

– Роўна тры тыдні. Спачатку сем сутак далі за парушэнне рэжыму (як быццам за тое, што прысеў на ложак), а затым дадалі пакаранне за тое, што не адказваў на пытанні нейкіх супрацоўнікаў адміністрацыі і не вітаўся з ахоўнікамі. Сказалі нам: «У вашага сына дрэннае выхаванне».

– Спатканне колькі доўжылася?

– Дзве гадзіны – з 10.00 да 12.00. Размаўлялі праз шкло па тэлефоне. Заўважыла, што сын пахудзеў. Твар набыў нейкі шэры колер. Хаця трымаецца ўпэўнена, праз слова – гумар.

11 чэрвеня адвакат, калі нічога не зменіцца, падае апеляцыю ў гарадскі суд, таму пакуль сын застанецца ў ізалятары. Але разумею, што шанцаў на змякчэнне прысуду практычна ніякіх няма.

– Апошнім часам многія кажуць, што палітвязням за кратамі прапаноўваюць напісаць прашэнне аб памілаванні. Дзмітрый пра такую прапанову нічога не казаў?

– Сын адразу сказаў, што ніякага прашэння прынцыпова пісаць не збіраецца. За што яму выбачацца? За тое, што спакойна сядзеў на крэсле на плошчы і збіраў подпісы за вылучэнне ў якасці кандыдата ў прэзідэнты Святланы Ціханоўскай? За тое, што невядомыя ў цывільным зацягнулі яго разам з гэтым самым крэслам у машыну і збілі там? Ды так збілі, што сын страціў прытомнасць.

Калі на судзе зачытвалі пра яго пабоі, то я папрасіла мужа, каб ён мяне вывеў з залы. Немагчыма было чуць такое. Дык няўжо за гэта трэба прыносіць прабачэнні і прасіць памілавання? Дзіма катэгарычна заявіў: «Не дачакаюцца!»

Сяргей ЗАБЛОЦКІ.

ТЭМА ДНЯ

Ці будзе амністыя?

Аргкамітэт па стварэнні партыі «Дэмакратычны саюз» заклікаў Палату прадстаўнікоў актывізаваць працу над законапраектам аб амністыі.

Аргкамітэт партыі ўзначальвае былы паплечнік **Валерыя Цапкалы** IT-прадпрымальнік **Андрэй Ланкін**.

Як паведамляла «Народная Воля», праект закона аб амністыі быў падрыхтаваны прадстаўнікамі інфармацыйна-аналітычнай установы «Круглы стол дэмакратычных сіл» на чале з палітолагам **Юрыем Васкрасенскім**. Да тэксту закона ёсць дадатак – спіс з 515 чалавек, якіх прапануецца амнісціраваць ці памілаваць. Там узгадваюцца **Віктар Бабарыка, Марыя Калеснікава, Алесь Пушкін.**

Васкрасенскі лічыць, што амнісціраванне або памілаванне зняволеных – адзін з крокаў, які дапамог бы зняць напружанне ў грамадстве.

«3 ліпеня Беларусь будзе адзначаць сваё галоўнае свята – Дзень Рэспублікі, – гаворыцца ў заяве аргкамітэта па стварэнні палітычнай партыі. – *У гэты дзень у 1944 годзе ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў вызвалены Мінск. Амаль палова Беларусі яшчэ была пад кантролем нацыстаў, але гэты дзень стаў вырашальным у аперацыі «Баграціён».*

У гэты дзень Беларусь святкуе вызваленне. На жаль, родныя і блізкія людзі часткі нашых грамадзян у гэты дзень будуць знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі.

Можна лічыць, што леташняе палітычнае супрацьстаянне скончылася перамогай над пазасістэмнай апазіцыяй. Таму мы заклікаем беларускі парламент ўспомніць савецкую практыку амнісціравання людзей, асуджаных за антыдзяржаўную дзейнасць. Так, у жніўні 1923 года, адразу пасля заканчэння грамадзянскай вайны, ЦВК СССР пастанавіў вызваліць рабочых і сялян, асуджаных за ўдзел у руху супраць савецкай улады, уцягнутых з прычыны сваёй несвядомасці і якія не з'яўляюцца ініцыятарамі, арганізатарамі і актыўнымі кіраўнікамі.

Амністыя ў Год народнага адзінства стане актам гуманізму з боку дзяржавы і значным крокам на шляху да аднаўлення міру і згоды ў нашым грамадстве».

Галіна РУТ.

ПОЗИЦИЯ

«Справедливый мир»: партия левых о конституционной реформе

Белорусская партия левых «Справедливый мир», выражая и отстаивая интересы людей, работающих по найму, живущих на доходы от собственной трудовой деятельности или получающих пенсии, стипендии и другие социальные пособия, выступает за конституционную реформу, которая:

создаст прочный фундамент народовластия и правового государства;

обеспечит условия для устойчивого функционирования сильных и дееспособных государственных институтов, подконтрольных гражданам Беларуси;

будет содействовать устойчивому политическому и социально-экономическому развитию страны и повышению благосостояния людей;

предоставит людям больше свобод, больше прав, больше возможностей для удовлетворения своих потребностей и интересов.

Белорусская партия левых «Справедливый мир» считает, что для достижения обозначенных целей в Основном законе требуется:

В разделе «Основы конституционного строя»

В статью 7 ввести норму о безусловном верховенстве Конституции над другими законодательными и нормативными актами государственных органов. Установить, что государство, все его органы и должностные лица действуют в пределах Конституции и принятых в соответствии с ней законов. Правовые акты, противоречащие положениям Конституции и законов, не имеют юридической силы.

В части первой статьи 13 записать: «Собственность может быть государственной, общественной и частной», а часть шестую изложить в редакции: *«Земля, недра, воды и леса являются общенародным достоянием и находятся в исключительной собственности государства».*

Статью 16 дополнить положением: *«Церковь в Беларуси отделена от государства и школа – от церкви».*

В разделе «Личность, общество, государство»

Часть вторую статьи 21 дополнить нормой: *«Государством устанавливается гарантированный минимальный размер оплаты труда, пенсий, стипендий и пособий, которые обеспечивают гражданам возможность приобретать товары и услуги, удовлетворяющие их главные физиологические, социальные и культурные потребности».*

Статью 33 дополнить положением: *«Контроль за соблюдением государственными средствами массовой информации прав граждан на получение и распространение полной, достоверной и своевременной информации о деятельности государственных органов, общественных объединений, о политической, экономической, культурной и международной жизни, состоянии окружающей среды осуществляет Общественный совет, состоящий из представителей политических партий и общественных объединений. Персональный состав Общественного совета и положение, регламентирующее его деятельность, утверждаются парламентом».*

Статью 35 изложить в редакции: *«Граждане Беларуси имеют гарантированное право на проведение собраний, митингов, уличных шествий, демонстраций и пикетирования, не нарушающих правопорядок. Это право не может быть ограничено никакими законодательными и нормативными актами».*

Часть третью статьи 41 дополнить предложением: *«Любое вмешательство государственных органов в уставную деятельность профессиональных союзов трудящихся запрещается».*

Статью 43 изложить в редакции: *«Трудящиеся имеют право на отдых. Для работающих по найму это право обеспечивается установлением рабочей недели, не превышающей 35 часов, сокращенной продолжительностью работы в ночное время, предоставлением ежегодных оплачиваемых отпусков, дней еженедельного отдыха».*

Дополнить часть первую статьи 43 предложением: *«Оказание платных медицинских услуг в государственных учреждениях здравоохранения Беларуси запрещено».*

Статью 47 дополнить частью второй: *«Средний размер назначенных пенсий не может быть менее 50 процентов от средней заработной платы по республике».*

Часть третью статьи 49 дополнить предложением: *«Государственные учреждения среднего специального и высшего образования не могут обучать граждан Беларуси на платной основе».*

Часть третью статьи 59 изложить в редакции: *«Должностные лица государственных органов и иные лица, которым доверено исполнение государственных функций, совершившие действия, равно как и бездействие, которые создали препятствия в реализации гражданами конституционных прав и свобод, привлекаются к уголовной ответственности».*

В разделе «Избирательная система, референдум»

Внести изменения, позволяющие проводить выборы представительных органов государственной власти по пропорциональной либо пропорционально-мажоритарной системе.

Статью 65 дополнить положением, что подсчет голосов и подведение итогов выборов и референдумов проводятся открыто и гласно.

В разделе «Президент, Парламент, Правительство, суд»

Внести изменения, которые трансформируют президентскую форму правления в парламентскую. При которой:

однопалатный парламент становится высшим представительным и единственным законодательным органом. Парламент избирается сроком на 5 лет на всеобщих выборах в количестве 220 депутатов;

Правительство наделяется полномочиями высшего коллегиального органа исполнительной власти в области экономики, внешней политики, обороны, национальной безопасности, общественного порядка и других сферах государственного управления. Руководитель Правительства назначается парламентом по предложению партийных фракций, депутатских групп, депутатов большинством от избранных членов парламента. В течение одного месяца он представляет парламенту для назначения остальных членов правительства. Запрещается совмещать должности депутатов парламента и членов Правительства;

Президент Республики Беларусь избирается парламентом страны сроком на 5 лет и наделяется исключительно представительскими функциями. Президент не имеет права вмешиваться в работу других государственных органов. Деятельность Президента финансируется исключительно из государственного бюджета.

В главу «Суд» добавить положения о том, что судьи высших судов избираются парламентом, а судьи нижестоящих судов – местными Советами депутатов соответствующего уровня по рекомендации органов судебного самоуправления.

Статью 116 изложить в редакции: *«Контроль за конституционностью нормативных актов и соблюдение конституционной законности в государстве осуществляет Конституционный Суд.*

Конституционный Суд Республики Беларусь избирается парламентом в количестве 12 судей из юристов высшей квалификации. Срок полномочий членов Конституционного Суда – 11 лет.

Конституционный Суд по предложениям Парламента, Президента, Верховного Суда, граждан Республики Беларусь дает заключения о соответствии Конституции Республики Беларусь:

законов, международных договорных и иных обязательств Республики Беларусь;

актов межгосударственных образований, в которые входит Республика Беларусь;

актов любого другого государственного органа.

Нормативные акты или их отдельные положения, признанные Конституционным Судом неконституционными, утрачивают свою силу.

Компетенция, организация и порядок деятельности Конституционного Суда определяются законом».

В разделе «Местное управление и самоуправление»

Статью 119 изложить в редакции *«Руководители местных исполнительных и распорядительных органов назначаются на должность и освобождаются от должности соответствующими местными Советами депутатов.*

По решению местных Советов главы местных исполнительных органов могут избираться путем прямых выборов гражданами, проживающими в соответствующих областях, городах и районах».

Раздел «Прокуратура. Комитет государственного контроля»

Переименовать в раздел «Государственный контроль и надзор».

Надзор за четким и единообразным исполнением законов всеми государственными органами, местными представительными и исполнительными органами, предприятиями, организациями и учреждениями, общественными объединениями, должностными лицами и гражданами возлагается на Генерального прокурора Республики Беларусь и подчиненных ему прокуроров. Генеральный прокурор утверждается парламентом и подотчетен ему в своей деятельности. Прокуратура осуществляет надзор за исполнением законов при расследовании преступлений, за соответствием закону судебных решений, за выполнением законодательства в местах предварительного заключения, а также в учреждениях исполнительной системы уголовных наказаний. Следственный комитет входит в состав органов прокуратуры в качестве самостоятельного подразделения.

Комитет государственного контроля упраздняется. Контроль за исполнением государственного бюджета, использованием государственного имущества, исполнением актов парламента, которые регулируют отношения управления государственной собственностью, экономические, финансовые и налоговые отношения, возлагается на Контрольную палату. Контрольная палата осуществляет контроль за исполнением местных бюджетов и использованием органами местного управления и самоуправления государственных субвенций и дотаций. Совет Контрольной палаты избирается парламентом сроком на пять лет.

Добавить новый раздел «Уполномоченный по правам человека».

Уполномоченный по правам человека избирается парламентом сроком на 5 лет.

Компетенция и гарантии деятельности Уполномоченного по правам человека по рассмотрению обращений граждан, политических партий и других общественных объединений, связанные с нарушением их прав и свобод, определяются Законом.

***

Белорусская партия «Справедливый мир» считает недопустимым, чтобы в результате изменения конституционных положений были созданы новые органы власти, которые, не будучи избранными народом на свободных и справедливых выборах, получат полномочия по управлению делами государства и общества.

Решения от имени народа Беларуси могут приниматься исключительно национальными референдумами, а также парламентом страны, избранным на всеобщих и прямых выборах. Никакие другие государственные институты, включая Всебелорусское народное собрание, не могут наделяться таким правом.

Любые поправки в Конституции не должны уменьшать объем конституционных прав и свобод граждан, а также гарантий их соблюдения, установленных действующей Конституцией.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Не выключаю, што мужу прапаноўвалі вызваленне…»

*Жонка журналіста і палітвязня **Аксана ПАЧОБУТ** распавяла «Народнай Волі» пра тое, якія навіны даходзяць да яе з-за кратаў.*

Нагадаем, што 10 сакавіка гэтага года сілавікі завялі крымінальную справу за правядзенне імпрэзы ў польскай сацыяльнай школе скаўтаў імя Рамуальда Траўгута ў Брэсце. Тады затрымалі сузаснавальніка школы, 43-гадовага брэстчаніна і дырэктара **Ганну Панішаву**. Пазней стала вядома абператрусах у Лідзе, Ваўкавыску і затрыманнях **Ірэны Бярнацкай** і **Марыны Цішкоўскай.**

23 сакавіка ў Гродне была затрымана кіраўнік не прызнанага ўладамі Саюза палякаў **Анжаліка Борыс**, а яшчэ праз два дні – журналіст і актывіст гэтага ж саюза **Андрэй Пачобут**.

Яны былі затрыманы ў межах крымінальнай справы паводле ч.3 арт.130 «Распальванне расавай, нацыянальнай варожасці». Паводле гэтага артыкула абвінавачанаму можа пагражаць ад 5 да 12 гадоў пазбаўлення волі.

Дарэчы, днямі Ірэну Бярнацкую, Марыю Цішкоўскую і Ганну Панішаву вывезлі з СІЗА ў Польшчу.

Пазней Наталля Эйсмант, прэс-сакратар Аляксандра Лукашэнкі, пракаментавала гэта так. Маўляў, у сярэдзіне красавіка адбылася сустрэча Лукашэнкі з першым прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым. Тады і гаварылася пра вызваленне некаторых дзеячаў беларускага Саюза палякаў. І менавіта Нурсултан Абішавіч за іх прасіў, пасля чаго было прынята гэтае рашэнне.

Паводле некаторай інфармацыі, Борыс і Пачобуту таксама прапаноўвалі вызваленне ў абмен на выезд з Беларусі, але яны адмовіліся…

– Андрэй мне піша практычна кожны дзень, хаця лісты прыходзяць нерэгулярна, – кажа **Аксана ПАЧОБУТ**. – Напрыклад, дзесяць дзён можа не быць карэспандэнцыі, а затым прыходзяць адрасу некалькі лістоў.

Цэнзура таксама вяртае мужу некаторыя яго допісы на волю. Напрыклад, калі пісаў пра ўмовы знаходжання ў СІЗА на Валадарскага, гэты ліст цэнзары завярнулі.



Але па вялікім рахунку трэба адзначыць, што лісты, хаця і са спазненнем, але практычна ўсе даходзяць.

– Што Андрэй піша пра сябе і сваю справу?

– Найперш просіць, каб перадала прывітанні ўсім знаёмым. Піша, што адчувае сябе нармальна, да ўсяго прызвычайваецца, але ў той жа час адвакат мне кажа, што Андрэй хварэе. І гэта цягнецца, відаць, ужо каля двух месяцаў, адна хвароба пераходзіць у другую.

У камеры, дзе сядзіць муж, вельмі душна, іх там, здаецца, трынаццаць чалавек.

– Раней была інфармацыя, што Андрэю не дазвалялі перадачу з лекамі…

– Каля двух тыдняў таму мы яму перадалі лекі, а праз тыдзень муж паведаміў, што да яго нічога не патрапіла. Зрабілі паўторную перадачу, і як быццам гэтым разам усё нармальна. Я не ведаю, што там здарылася, але добра, што ўсё добра скончылася.

А вось дрэнная навіна – гэта тое, што ў ізалятары Жодзіна Андрэя паставілі на ўлік як экстрэміста, «схільнага да дэструктыўных дзеянняў». І негатыўных наступстваў ад гэтага даволі шмат. Кожныя дзве гадзіны сярод «экстрэмістаў» пераклічка, часцей праходзяць вобшукі ў камеры…

– З чым звязана тое, што Андрэя залічылі ў «экстрэмісты»?

– Думаю, з тым артыкулам, паводле якога ён абвінавачваецца. Вельмі многія палітычныя вязні трапляюць у гэтую «экстрэмісцкую» катэгорыю.

Я ўвогуле здзівілася, што туды залічылі і мужа, бо думала, што такі статус даюць вязням, якія ўжо асуджаны і накіроўваюцца ў калонію.

Але тым не менш Андрэя паставілі на ўлік, і, мяркую, Анжаліка Борыс таксама патрапіла ў гэты спіс, хаця пра гэта дакладна не вядома.

– Скаргі на ўмовы ўтрымання былі?

– Андрэй наогул ні на што не скардзіцца, ён проста апісвае ўмовы знаходжання ў камеры. Наколькі я зразумела, на прагулкі не ходзіць, а вось перадачы атрымлівае. Хаця ў плане ежы муж вельмі неперабарлівы. У звычайным жыцці ў яго таксама сціплыя, абмежаваныя патрэбы, таму нават баіцца нас турбаваць, просіць, каб не ездзілі да яго ў Жодзіна з гэтымі перадачамі, бо, маўляў, гэта далёка.

З Андрэем складана, бо ў яго цяжка дапытацца, што насамрэч патрэбна. Але я дакладна ведаю, што яму вельмі падабаецца гарбата ройбуш, таму пастаянна яе дасылаю. Адпраўляю таксама несалёныя арэхі. У Андрэя ёсць пэўныя праблемы са страўнікам, таму яму не ўсё можна есці. Кажа, каб на кілбасу нават не трацілі грошы.

– Ці ёсць што пачытаць у камеры? Кнігі вы перадавалі?

– Ні ў СІЗА на Валадарскага, ні ў Жодзіне не прымаюць ніякую літаратуру. Нават падручнікі і кнігі па юрыспрудэнцыі. Хаця не так даўно ў жодзінскім ізалятары паабяцалі, што Крымінальны кодэкс прымуць і перададуць мужу.

Калі Андрэя затрымлівалі, ён узяў з сабой з дома адну кнігу на польскай мове, але, наколькі мне вядома, яе арыштавалі, а таму недзе ляжыць на складзе.

– Ці праводзяцца з вашым мужам нейкія следчыя дзеянні? Што вядома пра гэта?

– Складана нешта даведацца пра тое, як рухаецца справа, бо адвакаты далі падпіску аб неразгалошванні. Думаю, следчыя робяць спробы дапытаць Андрэя, але, ведаючы яго, не думаю, што дыялог у іх атрымліваецца.

Зараз таксама праводзіцца экспертыза рэчаў, якія забралі падчас вобшуку, і частку з іх мне ўжо аддалі: флэш-карты, сшыткі Андрэя, кнігі, мабільны тэлефон дзіцяці…

– Як вы і дзеці трымаліся гэтыя тры месяцы?

– Для мяне не ўпершыню праходзіць праз такія выпрабаванні. Дачка Яна ў нас ужо дарослая, студэнтка. Яна ўсё разумее і, натуральна, перажывае за тату. Сыну Яраславу – 10 гадоў, але пры ім я стараюся не паказваць, якія страшныя рэчы адбываюцца зараз, бо ён павінен мець сваё дзяцінства. Яраслаў думае, што дарослыя разбяруцца і вырашаць праблему, пасля чаго тата зноў будзе дома. Ён пакуль не ўяўляе, наколькі сур'ёзная сітуацыя.

– Днямі стала вядома, што Ірэну Бярнацкую, Марыю Цішкоўскую і Ганну Панішаву вызвалілі з СІЗА і зараз яны ў Польшчы. Прэс-сакратар Лукашэнкі затым заявіла, што гэтаму пасадзейнічаў былы прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў… Якім бокам экс-кіраўнік Казахстана датычны да «польскай справы» і яе фігурантаў?

– Для мяне самой, як і для многіх, такі паварот падзей – вялікая загадка. Таму з гэтай нагоды ў сацыяльных сетках больш жартаў і кпінаў, чым спроб знайсці адказ на пытанне, пры чым тут Назарбаеў.

Я мяркую так: або фантазія ў пэўных людзей вельмі разыгралася, або мы чагосьці не ведаем.

– Андрэй асабіста не знаёмы з Назарбаевым?

– Калі і знаёмы, то хіба што гэта была таямніца ад сям'і.

– Праўда, што яму таксама прапаноўвалі вызваленне і пераезд у Польшчу, але ён адмовіўся?

– Стопрацэнтнага пацяврджэння гэтаму ў мяне няма, але ў ранейшых лістах Андрэй заяўляў адназначна: нікуды з'язджаць ён не збіраецца. Безумоўна, не выключаю, што яму таксама прапаноўвалі вызваленне, але факт застаецца фактам: муж па-ранейшаму ў ізалятары.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ДЕМОКРАТИЯ ПО-БЕЛОРУССКИ

Сергей ЧЕРЕЧЕНЬ:

«Пока нам прислали отписку…»

*Почти год бизнесмен и экс-кандидат в президенты Беларуси **Сергей Черечень** не может найти консенсус с Министерством промышленности по совершенно простому вопросу – он хочет взять под свое управление любое самое отсталое промышленное предприятие. Но чиновники – ни в какую! «Народная Воля» поинтересовалась деталями.*

Напомним, что еще до президентских выборов минувшего года Сергей Черечень отреагировал на предложение А.Лукашенко реформировать любое из белорусских предприятий.

«Если наши кандидаты или вечные эксперты-экономисты, нигде не работавшие, кроме интернет-форумов и телеграм-каналов, знают рецепт, как без социальных взрывов реформировать предприятия, я готов их не только выслушать, – сказал Лукашенко, обращаясь с посланием к народу и парламенту. – *Более того, обещаю любому дать возможность показать себя на практике. Предприятий предостаточно – крепких, хороших, например, БАТЭ, «Могилевхимволокно», «Белшина», «Камволь» – выбирайте, идите, покажите себя, как вы умеете это делать».*

Черечень заявил, что готов хоть завтра взять развитие Минского моторного завода под свое крыло. Причем вне зависимости от исхода выборов: *«Мы готовы провести комплексный аудит (диагностику) на Минском моторном заводе и дать подробное заключение о деятельности предприятия с указанием проблемных зон. На основании результатов аудита нами будут предложены рекомендации по плану мероприятий и конкретных действий для выхода предприятия из кризиса и повышения его эффективности».*

Директор Моторного завода на одной из встреч в Минпроме заявил, что предприятие, которым он руководит, не убыточное. И предложил, чтобы Черечень и его команда положили глаз не на более-менее успешно работающий завод, а выбрали тот, который на самом деле нуждается в антикризисном управлении. Черечень согласился и на это предложение, а Министерство промышленности пообещало подготовить список новых предприятий – на выбор. Однако на этом всё и заглохло.

– Сергей, расскажите, на какой стадии сейчас находятся ваши многострадальные переговоры с Министерством промышленности?

– Пока нам прислали отписку: мол, у Минпрома есть некий стратегический план развития, они его сейчас будут реализовывать и в процессе его реализации обратятся к нам за помощью. Но это будет когда-нибудь потом.

– А что со списком предприятий, из которых вы могли бы выбрать самое захудалое?

– Похоже, все замялось. Я несколько месяцев не педалировал этот вопрос, был занят другими делами, поездками. Мы говорили, что на одном из предприятий хотели бы показать свою работу в действии, а дальше можем взять в свое антикризисное управление любой завод. И просили пустить нас на абсолютно любое предприятие – даже самое замшелое, пусть даже в стадии банкротства. Мы провели бы свою экспертизу, дали бы свои рекомендации по выходу из кризиса и наладили все процессы. Но, похоже, чиновники вообще боятся допускать нас к государственным предприятиям – там, видимо, можно наковырять много, мягко выражаясь, управленческих недочетов. Опасаются, что независимые эксперты, возможно, вскроют какие-то коррупционные вещи, которые хотелось бы утаить. Поэтому сейчас и пытаются всячески юлить и выкручиваться, чтобы не дать нам возможности получить предприятие.

– Хотя слова Лукашенко прозвучали весьма прямолинейно: идите и работайте.

– Да, во время его выступления всё звучало очень конкретно. И Администрация президента дала поручение Минпрому, которое они выполнять совсем не спешат.

Сейчас мы на той стадии, когда нам ясно сказали: мы про вас помним, но давайте вернемся к этому вопросу когда-нибудь потом. Но я не намерен ждать, а в самое ближайшее время уточню: может, это «потом» уже наступило?

Чиновники боятся делать конкретные шаги. Они боятся ответить нам «нет» и попасть под раздачу и боятся сказать «да» и тоже попасть под раздачу.

Чем отличается частник от госструктуры? Он рискует своими деньгами, несет ответственность за активы, за людей и поэтому всегда шевелится. А когда у тебя есть бюджет государственный, то зачем напрягаться? Денег все равно дадут. Вот чиновничья вертикаль и не напрягается.

Но я буду настаивать на своем, я хочу получить предприятие в управление.

– С министром промышленности, бывшим гендиректором БелАЗа Петром Пархомчиком вы встречались?

– Нет, из чиновников Минпрома вели переговоры с заместителем министра промышленности Александром Огородниковым. Плюс руководящий состав и бухгалтерия Минского моторного завода. А министры – они же все очень занятые. Не понятно только, чем они занимаются…

– Вы встречались с руководством Минского моторного завода. А с рабочими? Какие сегодня настроения у людей? На МЗКТ, например, некоторые кричали в лицо Лукашенко «Уходи!». Где сегодня эти люди?

– С некоторыми мы поддерживаем связь. Знаю, что отдельных уволили. По факту фонды, которые создавались для того, чтобы поддержать бастующих, помогли немногим. Большинство рабочих бросили на произвол судьбы, людей лишили средств к существованию.

– У вас есть конкретные факты?

– Да, у меня люди попали в потасовку с омоновцами – им никто даже не помог выехать из страны.

Поэтому говорить сегодня о каких-то протестах на предприятиях… В прежние времена люди не были настолько закредитованы, как сейчас. Почти у каждого



был свой земельный надел, можно было что-то выращивать и не умереть с голода. Люди могли прожить на подсобном хозяйстве. А сейчас это невозможно – у всех есть определенное обременение, люди фактически в кабале у государства. И сегодня далеко не каждый может махнуть рукой и сказать: «Да хрен с ним, полгода как-то протянем!» Потому что лучше стабильно плохо, но с зарплатой. Логика простая.

– По-вашему, как разрулить сложившуюся ситуацию?

– Протеста уже нет. Вывести людей на улицы теперь нереально – слишком большой прессинг.

– Как говорил Роман Протасевич, только голодные бунты могут вывести людей на протесты.

– До голодных бунтов экономика Беларуси должна падать еще очень долго. И ей не дадут этого сделать. И даже если совсем не будет возможности привлечь деньги извне, у нас есть еще что продавать. Август-сентябрь минувшего года – тогда еще была возможность что-то поменять. Сейчас, на мой взгляд, всем необходимо успокоиться и попытаться найти какой-то приемлемый консенсус.

– То есть вы за компромисс?

– Да. И я не понимаю, как сегодня можно по-другому. Лукашенко не собирается уходить, тем более его поддержал Путин. Переговорный процесс должен быть обязательно.

– Складывается впечатление, что сегодня все уже забыли, с чего всё начиналось – спорные результаты президентских выборов.

– Фальсификация результатов выборов подняла людей на протест. Люди вышли и показали, что они думают и чего хотят. Это главный результат выборов. А сейчас просто качать ситуацию… Это как если бы спринтеру отрубили ноги, а он пытался бы на руках ползти к финишу. Но он всё равно уже не победит…

Сейчас необходимо выйти из этой драки с наименьшими потерями. Есть давление со стороны Евросоюза – это надо использовать и вести разговор про следующие президентские выборы под эгидой ОБСЕ и других международных институтов.

– Политзаключенных выпустить, объявить амнистию?

– Политзаключенные – это предмет торга. С точки зрения власти, если нет дискуссии, переговорного процесса – зачем их выпускать?

Лукашенко – жесткий человек. На мой взгляд, он будет использовать этот актив не в ближней, а в дальней перспективе. И я не думаю, что отпустят всех политзаключенных.

Хотя, мы знаем, на днях Владимир Макей встречался с дипломатами. Информации о том, как прошла эта встреча, не очень много, но это хотя бы первый контакт, хоть какой-то разговор за последние полгода! Мне кажется, по дипломатической линии всегда должен идти диалог, несмотря ни на что. Но европейские страны сегодня действуют точно так же импульсивно, как и Лукашенко. И пока все эти импульсы не улягутся и все не начнут друг с другом разговаривать, ничего не изменится. А в последние полгода никто ни с кем нормально не общается.

– Какова ваша позиция по поводу санкций?

– Я считаю, что необходимо подготовить жесточайший пакет санкций по отношению к Беларуси, но не вводить его до последнего момента, а использовать как рычаг давления. Потому что санкции бьют не по Лукашенко и его окружению, а по обычным людям. Те же рабочие будут страдать, но не чиновники.

– Как думаете, небо надолго останется закрытым?

– Надеюсь, что нет. Это небольшие потери для страны – убытки для «Белавиа», кажется, около 6 миллионов долларов в месяц, в целом в республиканском масштабе это небольшие деньги. Но это жесткий дискомфорт для людей. Причем не только для наших, для европейцев тоже. Надеюсь, здравый смысл всё же восторжествует.

Сейчас все ждут разговора Путина с Байденом. От того, какие приоритеты будут расставлены там, во многом и будет зависеть, как решится ситуация по воздушному сообщению, по санкциям. Белорусский вопрос будет обсуждаться недолго, но в повестке дня он будет стоять, и основные акценты будут расставлены. Так что ждем.

Марина КОКТЫШ.

На фото: Сергей Черечень работы не боится.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Зразумелі гэта і бамжы: нельга жыць, як колісь, у ілжы

Састарэлага мінскага бамжа Аляксандра Кутаса асудзілі на 20 сутак арышту за тое, што ён трымаў БЧБ-сцяг. А ўвогуле на рахунку «бамжа-пратэстанта» ўжо роўна 100 сутак арышту…

Лёс бамжоў заўсёды вельмі горкі,
Зняважаць такіх – вялікі грэх…
На памыйках-сметніцах разборкі
За аўтарытэт сярод «калег»;
Вечныя ад голаду пакуты,
А калі наблізіцца зіма,
Дужа дапякае холад люты –
Паратунку ўвогуле няма,
І парой скуголяць па-сабачы,
Скручаныя сцюжай у сувой…
Большае няма для іх удачы,
Чым хоць нейкі дах над галавой.
У мужчыны гэтага таксама
Доля незайздросная была.
Пэўна, колісь здарылася драма,
Вынік – ні прапіскі, ні жытла.
Цяжка рады даць такому гору…
Ды жыццё зрабіла дзіўны крэн,
І на беларускую прастору
Уварваўся вецер перамен.
І прынёс ён подых маладосці,
Даў падказку ўсім, куды ісці.
«Можа, памяняецца хоць штосьці
І ў маім бязрадасным жыцці?
Трэ жывому думаць пра жывое,
Рана кіравацца да кладоў.
Можа, нейкі дах над галавою
Мецьму я на старасці гадоў…» –
Так падумаў бомж.
Таму з імпэтам
Рушыў за пратэстнаю гурмой.
Бурным быў імпэт спякотным летам,
Не астыў халодною зімой.
Сам набыў ці людзі падарылі
Яркі бел-чырвона-белы сцяг.
Для бамжа той сцяг – нібыта крылы.
З гордасцю насіў яго ў руках.
Пра старога ўжо хадзілі чуткі:
Пратэстує лепш, чым малады!
І таму не дзіва, што на «суткі»
Выпраўлялі строгія суды.
Трапіў у астрог і ў раз чарговы.
Можа быць, я трошачкі зманю,
Ды яго служакі, што з ахоўы,
Успрымаюць зараз як радню:
Бомж у сценах гэтага «палаца»
«Сутачны» сустрэне юбілей.
Толькі не збіраецца здавацца,
Дзёрска бунтавацьме і далей.
Не баіцца ён улады ціску,
Нават спадзяецца, што к зіме,
Можа, пастаянную прапіску
Атрымае ўсё-такі ў турме…
***
Нельга ўвесь народ карміць лухтою,
Нельга патапіць яго ў ілжы.
Не ўтрымацца ўладзе, калі тое
Разумеюць нават і бамжы.

Не змог

– Павер, што я ўспрымаю з болем:
Ты развялася, кажуць, з Колем…
– А ці жыла б ты з чалавекам,
Што да цябе – заўжды са дзекам,
Бязбожна курыць, п'е, як дзюдзя,
Яшчэ й бярэ цябе за грудзі,
Па тыдні не бывае дома?..
– Я не змагла б з ім жыць, вядома.
Прагнала б тут жа за парог.
– Дык вось і Коля мой не змог…

Спартыўны касцюм

Выпівалі неяк у гурбе.
Азадачыў нас дзяцюк актыўны:
– А чаму купляе для сябе
Братка-беларус касцюм спартыўны?
Той касцюм купляе ён цяпер
Не таму, што фізкультура ў модзе, –
Ці ў бальніцу легчы ёсць намер,
Ці гарэлку жлукціць на прыродзе…

ОСМЫСЛЕНИЕ

Борис ПАСТЕРНАК, издатель, публицист

Площадь перемен в Беларуси огромна



Собственно, это сегодня вся страна.

Когда-нибудь будет написан роман «Площадь Перемен». Или опера. Великие композиторы любили такие сюжеты – героические и трагические.

Спасибо «Фейсбуку», он постоянно напоминает, что было год назад. И если просто полистать страницы, сразу увидишь, что в летописи белорусского протеста сами собой стали возникать длинные сюжеты – с энергичной драматургией, яркими героями, реальным и очень наглядным противостоянием добра и зла. Эти сюжеты пока словно смотаны в клубки, они еще ждут своих мастеров – писателей, драматургов, режиссеров. А потом, конечно, и читателей, и зрителей – сопереживающих, готовых к горячему чувству и очистительным слезам.


Я просто напомню цепочку событий.

Еще во время предвыборной кампании в одном из городских скверов собрали митинг в поддержку Лукашенко. Диджеи, которым была поручена музыкальная часть мероприятия, вместо гимна врубили «Перемен!» **Виктора Цоя**. И вдобавок показали со сцены «викторию» – жест, ставший к тому времени символом протеста. Их посадили на 10 суток.

